Наша доля

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з верасня 1990 г.

№48 (157)
1 снежня 1994 г.
кошт у розніцу — 40 руб.

● 3 ДЕКАБРЯ -- ДЕНЬ ИНВАЛИДА

Ради социальной реабилитации

Этот день -- не за горами. Международный день инвалидов будет отмечаться во всем мире 3 декабря этого года. Поэтому решение Центрального правления БелОИ подготовить свои документы на имя Президента и Кабинета Министров Республики Беларусь вполне оправдано. Оно вызвано еще и тем, что в нашей стране вот уже скоро полгода как работает новое руководство, с которым тоже хотелось бы до конца определиться в своей деятельности.

В письме к главе Администрации Президента Республики Беларусь Л. Г. Синицыну, подписанном председателем ЦП БелОИ Н. И. Колбаско, говорится: «В связи с Международным днем инвалидов Центральное правление БелОИ направляет Вам свои предложения по решению вопросов социальной реабилитации инвалидов.

ЦП БелОИ считает, что для подчеркивания важности данной проблемы перечень мер, которые будут предприняты в этой связи государством, необходимо изложить в форме Указа Президента Республики Беларусь.

К данному письму ЦП БелОИ прилагает свой вариант проекта Указа Президента Республики Беларусь, а также проекта Генерального соглашения «Об основных принципах и направлениях сотрудничества между Кабинетом Министров Республики Беларусь и Белорусским обществом инвалидов», о котором говорится в п. 10 нашего проекта Указа Президента Республики Беларусь.

Как видим -- очень серьезные документы, принятие которых намного бы улучшило деятельность организаций БелОИ и жизнь самих инвалидов.

Отметим из этих двух проектов самые существенные положения, новые введения.

До 1 марта 1995 года разработать порядок кредитования строительства жилья (индивидуального и кооперативного) инвалидам, нуждающимся в улучшении жилищных условий. Планы же капитального строительства, программы социального развития, только согласованные с ЦП БелОИ и утвержденные Кабинетом Министров РБ, приобретают силу для всех госпредприятий, организаций и учреждений, независимо от уровня и подчиненности.

С 1 января 1995 года не допускаются проектирование и застройка городов и других поселений, разработка проектов на строительство и реконструкцию всех зданий и сооружений без учета требований доступности их для инвалидов, а также разработка и производство новых средств индивидуального и общественного пассажирского транспорта, связи и информатики без модификаций, приспособленных для пользования инвалидами.

Кабинет Министров РБ гарантирует финансовое, материально-техническое и иное необходимое обеспечение программ медико-профессиональной, социальной, творческой и спортивной реабилитации, программ социального развития и планов капитального строительства объектов производственного и социального назначения, если в качестве основного подрядчика по их реализации является ЦП БелОИ.

Кабинету Министров РБ до 1 января 1995 года принять решение об установлении порядка приобретения инвалидами (на льготных условиях или бесплатно) автомобиля «Таврия», а также значительно увеличить ежегодную денежную компенсацию расходов на транспортное обслуживание, бензин, ремонт, техническое обслуживание автомобилей и мотоколясок и запасных частей к ним.

Министерству образования и науки, Министерству социальной защиты, Министерству здравоохранения Республики Беларусь совместно с общественными организациями инвалидов до 1 марта 1995 года представить предложения об образовании Белорусского научно-исследовательского института проблем инвалидности.

Республиканскому центру занятости населения Республики Беларусь с 1 января 1995 года ввести в штатное расписание областных (Минского городского) центров занятости населения штатную единицу по профессиональной реабилитации и обеспечению занятости инвалидов.

Министерству финансов РБ в 1995 году выделить Центральному правлению БелОИ денежные средства для завершения обработки «Учетных карт инвалидов» и создания Республиканского банка данных об инвалидах на магнитных носителях.

Думается, что все эти положения могут быть реализованы. Важно, чтобы было понимание и заинтересованность со стороны руководства республики. Инвалиды, как видите, не хотят много, а только самое необходимое и удобное для них.

Во всем мире инвалиды находятся на особом статусе, им помогает, их уважает государство. И хотя все мы понимаем, что сейчас, как никогда, трудно нашей стране, однако нужно найти все средства, чтобы помочь Белорусскому обществу инвалидов. Иначе, отмечая Международный день инвалидов, нас не поймут за рубежом.

Наша республика в который раз может прослыть нецивилизованной страной. А этого никому не хочется -- ни простым людям, ни руководству.

Е. Занёманский

О мерах по выполнению постановления Кабинета Министров Республики Беларусь от 31 октября 1994 г. N 154

Постановление Министерства труда Республики Беларусь от 16 ноября 1994 г., N 110

Во исполнение постановления Кабинета Министров Республики Беларусь от 31 октября 1994 г. N 154 «О повышении размера минимальной заработной платы» и в связи с установлением с 1 ноября 1994 г. для работников предприятий, учреждений и организаций, финансируемых из бюджета, тарифной ставки первого разряда 22000 рублей, новых размеров доплат к тарифным ставкам и должностным окладам, рассчитанным в соответствии с Единой тарифной сеткой, с первого по седьмой тарифные разряды, Министерство труда по согласованию с Министерством финансов Республики Беларусь постановляет:

1. Установить, что предусмотренные пунктом 2 постановления Кабинета Министров Республики Беларусь от 31 октября 1994 г. N 154 доплаты к тарифным ставкам и должностным окладам распространяются и на работников предприятий, учреждений и организаций, финансируемых за счет средств бюджета, которым устанавливаются месячные оклады, рассчитанные по тарифным коэффициентам вне разрядов Единой тарифной сетки, и их коэффициенты находятся на уровне с 1-го по 7-й разряды включительно.

2. Ввести для работников, коэффициенты которых находятся между 7-м и 8-м разрядами, доплаты к их ставкам, окладам в следующих размерах:

2300 рублей — для которых коэффициенты не превышают 3,13;

1800 рублей — для которых установлены коэффициенты от 3,14 до 3,22;

1500 рублей — для которых установлены коэффициенты от 3,22 до 3,28.

3. Предусмотренные пунктом 2 постановления Кабинета Министров Республики Беларусь от 31 октября 1994 г. N 154, а также пунктами 1 и 2 настоящего постановления доплаты включаются в ставки и оклады работников предприятий, учреждений и организаций, финансируемых за счет средств бюджета, и образуют новые размеры ставок и окладов.

4. Считать утратившим силу постановление Госкомтруда Республики Беларусь от 30.03.94 г. N 40 «О внесении изменений в постановление Госкомтруда Республики Беларусь от 12 января 1994 г. N 9 «Об утверждении новых тарифных коэффициентов Единой тарифной сетки работников бюджетных предприятий, учреждений и организаций».

5. Настоящее постановление ввести в действие с 1 ноября 1994 г.

Министр труда
А. Соснов

Зарегистрировано 16 ноября 1994 г. в Реестре государственной регистрации, регистрационный N 612/12.

● КАК ЖИВЕШЬ, ПЕРВИЧКА?

Милосердие -- состояние души

Три года назад был принят Закон «О социальной защите инвалидов Республики Беларусь». Хороший, надо сказать, закон! Люди воспрянули духом: «Не пропадем! Вот оно, наше спасение». Особенно всех радовала ст. 45 этого закона, в которой сказано: «инвалид имеет право на льготное обеспечение продуктами и промтоварами». Увы, оказалось, что это иллюзия! Где эти льготы в жизни? Есть только мизерная дотация, зато какие цены...

Вот почему районный отдел общества инвалидов вынужден был обратиться с письменной просьбой (с протянутой рукой) ко всем коллективам предприятий, их руководителям, частным предпринимателям с просьбой о помощи и перечислении средств на счет 000700024 в Чаусском госбанке для остронуждающихся инвалидов.

На эту просьбу пока отозвались ПМК-278, райсельхозэнергосбыт, райтоп. Что касается частных предпринимателей, то они и не подумали «отстегнуть» от своей прибыли даже «зайчика». Такая вот милосердность. Так что, если бы не райисполком и не рабочие коллективы, руководители колхозов и совхозов, наше общество не смогло бы купить трости для инвалида, не говоря уже о большем. Сердечную благодарность хочется выразить рабочему коллективу колхоза «Правда» и лично его председателю Купцову Александру Владимировичу. Они заботятся об инвалидах -- выделяют бесплатно транспорт для привоза топлива, технику для обработки земли, выдают сено, солому, зерно. А уж если случится беда -- умер инвалид или член его семьи -- колхоз все расходы берет на себя. В сущности, ни одна просьба не остается без внимания, а поборы за услуги осуждены.

Председатель колхоза Александр Владимирович молод, но, как говорят здешние инвалиды, у него мудрости больше, чем у иного ученого болтуна.

Не обходят вниманием инвалидов и в колхозах «Победа», «Искра», «18 партсъезд», «Реста», «Головенчицы», «Серп и молот», им. Дзержинского, «Заря». Систематически оказывают помощь в выписке газеты, на приобретение костылей, клюшек, открыток. Не стоят в стороне районная типография и узел связи.

Благодаря оказанной помощи в этом году районное общество обеспечило свыше 300 человек металлическими крышками, полиэтиленовой пленкой, простынями, а через магазин «Лига» по минимальным ценам были проданы гречневая крупа, сахар, пленка. Более 50 инвалидам -- одиноким и немощным -- выдано бесплатно по 100 кг картошки, а почти всем инвалидам города и района выписана газета «Наша доля» на 1-е полугодие 1995 года. Свыше 100 человек получили единовременное пособие от 5 до 10 тысяч рублей.

Однако некоторые хозяйства отделываются от просьб инвалидов обещаниями, забывая, что человек обращается за помощью не от хорошей жизни.

В колхозе «Звязда», например, который год обещают сложить печь в квартире двум престарелым инвалидам -- Раисе Шилович и Пелагее Шилович. Одевшись, несчастные отогреваются у электроплитки.

Подобную черствость к нуждам и просьбам инвалидов проявляют в колхозах «1 мая», «Хацкевичи», «Передовик». Здесь никогда не оказывается помощь нашему обществу. Очень трудно работать в таких хозяйствах председателям первичных организаций. В Чаусском районе 24 первички. Самая крупная -- это чаусская городская, которая насчитывает свыше 500 человек, однако председатель ее -- Примаков Александр Николаевич -- последнее время почему-то совершенно уклонился от проведения обследования малоимущих, посещения немощных, ходатайствования о помощи, заявив, что «мне за это никто ничего не платит». Хотя его можно понять в том смысле, что труд председателя все же должен оплачиваться. Почему бы горсовету не изыскать для этого возможность?

В большом долгу перед инвалидами в деревнях Прилесье, Русиновки. В городе Чаусы инвалид Зенько Сергей (ул. Азарова,1, кв. 33) и Хоботова Мария Тимофеевна (ул. Пролетарская, 10) с восьмидесятых годов просят узел связи телефонизировать их, но там отказывают. Не улучшены жилищные условия инвалиду I-й группы П. И. Алексеенко. Он отопляет свою квартиру углем, из-за чего часто попадает в райбольницу. Который год ожидает улучшения квартирных условий и Палабени В. И., несмотря на просьбы районного общества инвалидов.

3 декабря 1994 г. -- Международный день инвалидов. В районном Доме культуры состоится большой концерт. В фойе должен работать буфет с богатым ассортиментом продуктов (если их отпустят по сниженным ценам, то все гости -- инвалиды приобретут их).

В этот день будут чествовать инвалидов своего хозяйства в колхозах «Искра», «Советская Белоруссия», им.Ленина, «Правда» и других, исключение составляет руководство колхоза имени 1 мая: оно отказалось как-либо отметить эту дату.

Накануне Международного дня инвалида поздравляю всех инвалидов и желаю им улучшения здоровья и мужества, чтобы пережить эту зиму и отпраздновать всенародный праздник -- 50 летие со Дня Победы над немецко-фашистскими захватчиками.

Председатель Чаусского районного совета БелОИ Т. Коваленко

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ ПАПЯРЭДЖАННІ

Гэты Закон вызначае дзяржаўную палітыку Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў як састаўной часткі аховы грамадскага здароўя ў мэтах гарантый і забеспячэння ўмоў для яго захавання, аднаўлення і кампенсацыі парушаных або страчаных здольнасцей інвалідаў да грамадскай, прафесійнай і бытавой дзейнасці ў адпаведнасці з іх інтарэсамі і патэнцыяльнымі магчымасцямі.

ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Вызначэнне паняццяў

У гэтым Законе ўжываюцца наступныя паняцці з адпаведнымі азначэннямі:

папярэджанне інваліднасці -- сістэма медыцынскіх, гігіенічных, педагагічных, прафесійных і іншых мер, накіраваных на папярэджанне (прафілактыку) або змяншэнне частаты і цяжару інваліднасці;

рэабілітацыя -- працэс, які мае на мэце дапамагчы інвалідам дасягнуць аптымальнага фізічнага, інтэлектуальнага, псіхічнага і сацыяльнага ўзроўню дзейнасці і падтрымліваць яго, прадастаўляючы ім тым самым сродкі для змянення іх жыцця і расшырэння рамак іх незалежнасці;

медыцынская рэабілітацыя -- працэс, накіраваны на аднаўленне і кампенсацыю медыцынскімі і іншымі метадамі функцыянальных магчымасцей арганізма чалавека, парушаных з прычыны прыроджанага дэфекту, перанесеных хвароб або траўм;

медыка-прафесійная рэабілітацыя -- працэс аднаўлення працаздольнасці, які спалучае медыцынскую рэабілітацыю з вызначэннем і трэніроўкай прафесійна значных функцый, падборам прафесіі і адаптацыяй да яе;

прафесійная рэабілітацыя -- сістэма мер, якія забяспечваюць інваліду магчымасць атрымаць падыходзячую работу або захаваць ранейшую і перамяшчацца па службе (рабоце), садзейнічаючы тым самым яго сацыяльнай інтэграцыі або рэінтэграцыі;

працоўная рэабілітацыя -- працэс працаўладкавання і адаптацыі інваліда на канкрэтным рабочым месцы;

сацыяльная рэабілітацыя -- сістэма мерапрыемстваў, якія забяспечваюць паляпшэнне ўзроўню жыцця інвалідаў, стварэнне ім роўных магчымасцей для поўнага ўдзелу ў жыцці грамадства.

Артыкул 2. Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў выяўляецца ў стварэнні прававых, эканамічных, сацыяльных умоў для аховы здароўя і задавальнення патрэбнасцей інвалідаў у сродках рэабілітацыі і рэабілітацыйных паслугах.

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў ажыццяўляецца шляхам распрацоўкі і рэалізацыі праграм, якія забяспечваюць прадухіленне дэфектаў і парушэнняў функцый арганізма пры захворваннях і траўмах, папярэджанне і зніжэнне ўзроўню інваліднасці, а таксама стварэнне і развіццё сістэм рэабілітацыі ў рэспубліцы.

Артыкул 3. Заканадаўства аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў

Заканадаўства аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь складаецца з гэтага Закона, Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 4. Задачы заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў.

Задачамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў з'яўляюцца:

размежаванне кампетэнцыі ў галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў паміж органамі дзяржаўнай улады;

стварэнне прававых гарантый для арганізацыі і развіцця сістэмы папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў;

забеспячэнне і абарона правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на медыцынскую, прафесійную і сацыяльную рэабілітацыю;

вызначэнне правоў, абавязкаў, паўнамоцтваў, адказнасці і прававое рэгуляванне адносін юрыдычных і фізічных асоб у галіне папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў;

удзел грамадскіх арганізацый інвалідаў у дзяржаўных праграмах рэабілітацыі інвалідаў.

Артыкул 5. Дзяржаўная праграма па папярэджанню інваліднасці

Дзяржаўная праграма па папярэджанню інваліднасці ўключае:

вывучэнне прычын інваліднасці;

распрацоўку мер па папярэджанню або абмежаванню выпадкаў страты здароўя, уключаючы праграмы імунізацыі;

распрацоўку мер па папярэджанню прыроджаных дэфектаў, хранічных і прафесійных захворванняў, няшчасных выпадкаў, траўматызму, а таксама перабудову чалавечай псіхікі з дапамогай знешняга ўздзеяння;

стварэнне сістэмы ранняга выяўлення і прафілактыкі інваліднасці;

стварэнне спецыяльных праграм па зніжэнню траўматызму, заснаваных на дакументах, прынятых Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя;

распрацоўку праграм атэстацыі і рацыяналізацыі рабочых месцаў і ўмоў працы як мер прафілактыкі прафесійных і іншых захворванняў, абумоўленых нерацыянальнымі ўмовамі працы, што забяспечваюць папярэджанне страты прафесійнай працаздольнасці або яе аднаўленне ў выпадку страты або зніжэння;

правядзенне медыцынскага абследавання і аздараўлення дзяцей;

аналіз усіх выпадкаў траўматызму, выкліканых надзвычайнымі і экалагічнымі абставінамі або рызыкай узнікнення такіх абставін;

кантроль за празмерным выкарыстаннем лекавых сродкаў, наркотыкаў, алкаголю, тытуню і іншых стымулятараў;

стварэнне спецыяльных праграм па зніжэнню частаты і цяжару спадчыннай паталогіі, эндакрынных, псіхічных захворванняў, якія прыводзяць да інваліднасці, а таксама захворванняў на алкагалізм;

меры выхавання, растлумачальнай работы аб шкодзе курэння і алкагалізму, залішняй масы цела, недастатковай фізічнай актыўнасці як фактараў рызыкі анкалагічных, сардэчна-сасудзістых і іншых хранічных захворванняў;

навуковае забеспячэнне распрацоўваемых праграм;

падрыхтоўку кадраў;

адукацыйныя, асветныя і іншыя меры.

Зацвярджае Дзяржаўную праграму па папярэджанню інваліднасці і забяспечвае яе выкананне Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 6. Дзяржаўная праграма па рэабілітацыі інвалідаў

Дзяржаўная праграма па рэабілітацыі інвалідаў уключае:

стварэнне скаардынаванай сістэмы рэабілітацыі, якая забяспечвае бесперапыннасць і пераемнасць аднаўленчай тэхналогіі;

медыцынскую рэабілітацыю і абслугоўванне;

кансультаванне і аказанне дапамогі ў сацыяльнай сферы, у галіне псіхалогіі;

падрыхтоўку да самастойнага індывідуальнага догляду, уключаючы развіццё навыкаў камунікацыі, перамяшчэння, зносін з асобым комплексам мерапрыемстваў, неабходных для асоб з рознымі дэфектамі здароўя;

забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі рэабілітацыі;

спецыяльныя паслугі ў галіне адукацыі;

спецыяльныя паслугі па аднаўленню прафесійнай працаздольнасці, перападрыхтоўцы і працаўладкаванню, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць інваліда на рынку працы;

садзейнічанне ў стварэнні і развіцці каапераатываў інвалідамі і для інвалідаў;

аказанне неабходнай дапамогі ў стварэнні і развіцці навучальна-вытворчых прадпрыемстваў, камбінатаў, дробных прадпрыемстваў і іншых відаў вытворчых майстэрняў інвалідамі і для інвалідаў;

устраненне прыродных, камунікацыйных і архітэктурных перашкод, якія мяшаюць праезду, доступу і свабоднаму перамяшчэнню ў месцах, прызначаных для прафесійнага навучання і працы інвалідаў;

падрыхтоўку кадраў рэабілітацыйных службаў.

Зацвярджае Дзяржаўную праграму па рэабілітацыі інвалідаў і забяспечвае яе выкананне Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У Дзяржаўную праграму па рэабілітацыі інвалідаў са згоды Рэспубліканскага міжведамаснага савета па праблемах інвалідаў уключаюцца і асноўныя палажэнні праграм па пытаннях медыцынскай, прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Артыкул 7. Роля органаў дзяржаўнай улады ў забеспячэнні правоў грамадзян на прадухіленне дэфектаў і парушэнняў функцый арганізма пры захворваннях і траўмах і правоў інвалідаў на медыцынскую, прафесійную і сацыяльную рэабілітацыю

Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае правы грамадзян на прадухіленне дэфектаў і парушэнняў функцый арганізма пры захворваннях і траўмах і правы інвалідаў на медыцынскую, прафесійную і сацыяльную рэабілітацыю шляхам стварэння і развіцця службаў па падтрыманню здароўя, медыцынскай, прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі і забеспячэння сацыяльна-эканамічных умоў даступнасці гэтых службаў для ўсіх, гарантуючы пры гэтым штогадовае выдзяленне фінансавых сродкаў на іх развіццё.

Абсалютныя памеры нарматываў фінансавання падлягаюць індэксацыі ў адпаведнасці з тэмпамі інфляцыі.

Для прыцягнення інвестыцый дзяржава прадугледжвае рэжым найбольшага спрыяння для ўсіх, хто ўкладвае сродкі ў развіццё службаў здароўя і сістэмы рэабілітацыі.

Артыкул 8. Прапаганда здаровага спосабу жыцця

У мэтах папярэджання інваліднасці дзяржава забяспечвае прапаганду здаровага спосабу жыцця, павышэнне прэстыжу здароўя як галоўнага набытку грамадства. Пры гэтым разам з матэрыяльнымі затратамі на аздараўленне хворых і інвалідаў прымяняюцца меры, якія стымулююць намаганні здаровых грамадзян па захаванню ўласнага здароўя.

У Рэспубліцы Беларусь забараняецца рэклама алкагольных напіткаў і тытунёвых вырабаў ва ўсіх сродках масавай інфармацыі. Забараняецца таксама ўздзеянне не па волі чалавека на яго свядомасць гіпнозам, псіхатропнымі сродкамі, біялакацыйнымі, лейптоннымі або тэхнічнымі ўстаноўкамі.

Адказнасць за невыкананне дадзеных патрабаванняў вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 9. Крыніцы фінансавання праграм па папярэджанню інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў

Фінансаванне праграм па папярэджанню інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, фонду сацыяльнай абароны інвалідаў, фонду медыцынскага страхавання, фонду садзейнічання занятасці, а таксама добраахвотных узносаў суб'ектаў гаспадарання незалежна ад форм уласнасці, грамадскіх аб'яднанняў і асобных грамадзян, у тым ліку замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, іншых крыніц.

Артыкул 10. Удзел грамадскіх арганізацый інвалідаў у распрацоўцы і рэалізацыі праграм па папярэджанню інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў

Грамадскія арганізацыі інвалідаў на ўсіх узроўнях прымаюць удзел у распрацоўцы і рэалізацыі праграм па папярэджанню інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў.

Суб'екты гаспадарання незалежна ад форм уласнасці пры вырашэнні пытанняў папярэджання інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў прыцягваюць прадстаўнікоў таварыстваў інвалідаў да падрыхтоўкі і прыняцця адпаведных рашэнняў, а таксама да іх рэалізацыі.

Артыкул 11. Рэабілітацыйныя ўстановы

Рэабілітацыйнымі ўстановамі з'яўляюцца ўстановы, якія ажыццяўляюць працэс рэабілітацыі інвалідаў у адпаведнасці з рэабілітацыйнымі праграмамі і забяспечваюць захаванне дзяржаўных рэабілітацыйных стандартаў.

Акрамя дзяржаўных рэабілітацыйных устаноў могуць ствараца рэабілітацыйныя ўстановы і на недзяржаўным узроўні (прыватныя, грамадскія).

Да рэабілітацыйных устаноў адносяцца ўстановы наступных тыпаў:

рэабілітацыйна-медыцынскія;

рэабілітацыйна-экспертныя;

рэабілітацыйна-адукацыйныя;

рэабілітацыйна-прафесійныя;

рэабілітацыйна-сацыяльныя.

Дзейнасць дзяржаўных рэабілітацыйных устаноў усіх узроўняў рэгулюецца адпаведнымі тыпавымі палажэннямі, зацверджанымі Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь, і статутамі, якія распрацоўваюцца на іх аснове.

Тып і від рэабілітацыйнай установы ўстанаўліваецца пры яе рэгістрацыі на аснове ўзроўню і напрамку рэалізуемых рэабілітацыйных праграм.

Правы на рэабілітацыйную дзейнасць і льготы, звязаныя са статутам рэабілітацыйнай установы, узнікаюць з моманту выдачы дадзенай установе ліцэнзіі.

ГЛАВА 2. ПАПЯРЭДЖАННЕ ІНВАЛІДНАСЦІ

Артыкул 12. Узроўні папярэджання інваліднасці

Першасная прафілактыка інваліднасці -- зніжэнне частаты ўзнікнення парушаных функцый, якія ўскладняюць жыццядзейнасць і абмяжоўваюць працаздольнасць.

Другасная прафілактыка інваліднасці -- абмежаванне ступені парушэння функцый або зваротнае развіццё пры ўжо існуючых захворваннях, прыроджаных або набытых дэфектах.

Трацічная прафілактыка інваліднасці -- папярэджанне пераходу ўзнікшых або прыроджаных функцыянальных парушэнняў на ўзроўні інваліднасці ва ўстойлівыя дэфекты, фізічных парушэнняў -- да ўцяжарвання інваліднасці і непрацаздольнасці.

Папярэджанне інваліднасці на ўсіх узроўнях прадугледжвае сістэму па своечасовай рэалізацыі медыцынскіх, педагагічных, прафесійна-арыентацыйных, тэхнічных і іншых мэтавых мер.

Артыкул 13. Экспертыза прычын узнікнення захворванняў, якія прыводзяць да інваліднасці

Разам з традыцыйнай медыка-сацыяльнай экспертызай хворых і інвалідаў установамі аховы здароўя ажыццяўляецца экспертыза наступных прычын узнікнення захворванняў, якія прыводзяць да інваліднасці:

вытворчых;

медыцынскіх;

экалагічных;

сацыяльных;

асобасных.

Юрыдычныя і фізічныя асобы, вінаватыя ва ўзнікненні захворванняў, якія прыводзяць да інваліднасці, нясуць адказнасць, устаноўленую дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 14. Устанаўленне ступені страты здароўя

Інваліднасць і ступень страты здароўя ўстанаўліваюцца медыка-рэабілітацыйнымі экспертнымі камісіямі.

Палажэнне аб інваліднасці і ступені страты здароўя зацвярджаецца Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Устанаўленне інваліднасці і ступені страты здароўя суправаджаецца складаннем індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда, якая вызначае рэабілітацыйныя меры і тэрміны іх рэалізацыі.

Інваліднасць пажыццёва ўстанаўліваецца па захворваннях і дэфектах, якія не маюць зваротнага развіцця, і толькі пасля завяршэння індывідуальнай праграмы рэабілітацыі або яе этапа. Спіс такіх захворванняў і дэфектаў зацвярджаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 15. Папярэджанне прафесійных захворванняў

Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь па меры неабходнасці пераглядае і ўдакладняе спіс прафесійных захворванняў, а таксама патрабаванні да здароўя асоб, якія прымаюцца на вытворчасць са шкоднымі ўмовамі працы, перыядычна пераглядаючы і патрабаванні да кіраўнікоў вытворчасцей па аздараўленню ўмоў працы, да ўмоў і працягласці работы ў шкодных умовах працы, што выключаюць з'яўленне захворванняў і функцыянальных парушэнняў на ўзроўні інваліднасці ў працаздольным узросце.

За парушэнне ўказаных патрабаванняў суб'екты гаспадарання і іх службовыя асобы нясуць адказнасць, устаноўленую дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 16. Прафілактыка інваліднасці сярод дзяцей

З мэтай ранняга выяўлення скрытых дэфектаў разумовага развіцця, парушэнняў сенсорных органаў, рухальнай сістэмы ў дзіцяці ўстановы аховы здароўя забяспечваюць усім дзецям першага года жыцця ў рамках дыспансернага нагляду спецыялізаванае абследаванне ў дзіцячых дыягнастычных цэнтрах і дзіцячых паліклініках. Усім дзецям, якія маюць адхіленні ў стане здароўя, фізічным або разумовым развіцці, дзяржава прадастаўляе неабходную медыцынскую, педагагічную, псіхалагічную і дэфекталагічную дапамогу.

Метады, формы, аб''емы і тэрміны ажыццяўлення такой дапамогі вызначаюцца спецыялістамі і заносяцца ў карту --індывідуальную праграму рэабілітацыі. Індывідуальная праграма рэабілітацыі для дзяцей з''яўляецца дакументам, абавязковым для выканання.

ГЛАВА 3. МЕДЫЦЫНСКАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ

Артыкул 17. Сістэма органаў і ўстаноў па медыцынскай рэабілітацыі

У адзіную сістэму органаў медыцынскай рэабілітацыі ўваходзяць:

рэспубліканскія, абласныя, гарадскія, раённыя цэнтры рэабілітацыі, а таксама профільныя цэнтры пры навукова-даследчых інстытутах;

рэспубліканскія, абласныя, гарадскія дыспансеры медыцынскай рэабілітацыі і спартыўнай медыцыны;

рэспубліканскія, абласныя санаторна-курортныя ўстановы;

рэабілітацыйныя аддзяленні (ложкі) лячэбна-прафілактычных устаноў;

установы медыцынскай рэабілітацыі грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Артыкул 18. Задачы службы медыцынскай рэабілітацыі

Асноўнымі задачамі службы медыцынскай рэабілітацыі з'яўляюцца:

ацэнка вынікаў захворванняў і траўм;

ацэнка рэабілітацыйнага патэнцыялу;

складанне і рэалізацыя індывідуальных праграм медыцынскай рэабілітацыі хворых і інвалідаў;

ацэнка вынікаў правядзення медыцынскай рэабілітацыі.

Артыкул 19. Індывідуальная праграма медыцынскай рэабілітацыі хворых

Медыцынская рэабілітацыя хворых ажыццяўляецца ва ўсіх лячэбна-прафілактычных установах Рэспублікі Беларусь і на ўсіх стадыях ходу паталагічнага працэсу ў выпадку аслаблення або страты функцый арганізма.

Пры ўзнікненні ў хворых дэфекту здароўя ў выніку захворвання або траўмы, у тым ліку пры пераходзе захворвання ў хранічную стадыю, рэабілітацыйныя ўстановы складаюць індывідуальную праграму медыцынскай рэабілітацыі.

Індывідуальная праграма медыцынскай рэабілітацыі вызначае канкрэтныя аб'ёмы, метады і тэрміны правядзення рэабілітацыйных мер. Індывідуальная праграма медыцынскай рэабілітацыі з'яўляецца дакументам, абавязковым для выканання адпаведнымі лячэбна-прафілактычнымі ўстановамі.

Артыкул 20. Справаздачныя паказчыкі ўстаноў аховы здароўя па медыцынскай рэабілітацыі

Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь зацвярджаюць справаздачныя паказчыкі дзейнасці ўстаноў аховы здароўя па медыцынскай рэабілітацыі.

Артыкул 21. Санаторны этап медыцынскай рэабілітацыі

Санаторны этап медыцынскай рэабілітацыі ажыццяўляецца санаторна-курортнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 22. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне рэабілітацыйных устаноў

Установы, якія займаюцца рэабілітацыяй, маюць прыярытэтнае права на забеспячэнне памяшканнямі для гэтых мэт.

Суб'ектам гаспадарання незалежна ад форм уласнасці, якія ажыццяўляюць выпуск рэабілітацыйнага абсталявання і забяспечваюць сыравінай аддзяленні працатэрапіі, лячэбна-працоўныя майстэрні лячэбна-прафілактычных устаноў і ўстановы сацыяльнай абароны, прадастаўляецца льготнае падаткаабкладанне.

Артыкул 23. Фінансаванне медыцынскай рэабілітацыі

Хворым з інвалідызуючай паталогіяй пры наяўнасці рэабілітацыйнага патэнцыялу на час актыўнай рэалізацыі індывідуальнай праграмы рэабілітацыі выплачваецца дапамога з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Памер дапамогі вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ІНВАЛІДНАСЦІ І РЭАБІЛІТАЦЫІ ІНВАЛІДАЎ

ГЛАВА 4. ПРАФЕСІЙНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ ІНВАЛІДАЎ

Артыкул 24. Экспертыза прафесійнай прыгоднасці інвалідаў

Экспертыза прафесійнай прыгоднасці інвалідаў ажыццяўляецца медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй.

Да работы медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій прыцягваюцца спецыялісты па інжынернай псіхалогіі (псіхалогіі працы), педагагічныя работнікі, якія займаюцца навучаннем і прафесійнай падрыхтоўкай інвалідаў, спецыялісты Дзяржаўнай службы занятасці, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі па прафесійнай прыгоднасці ўключаецца ў прафесійны раздзел індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда і з'яўляецца падставай для ажыццяўлення прафесійнай арыентацыі, прафесійнай адукацыі і далейшага працаўладкавання.

Інвалідам пры наяўнасці рэабілітацыйнага патэнцыялу на час актыўнай рэалізацыі індывідуальнай праграмы рэабілітацыі замест назначанай пенсіі з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь выплачваецца дапамога, памер якой перавышае пенсію на 50 працэнтаў.

За рэабілітуемым на час рэабілітацыі захоўваецца ранейшае месца работы ці прыярытэтнае права заняцця іншай пасады на тым жа прадпрыемстве па набытай спецыяльнасці ў працэсе рэабілітацыі.

Артыкул 25. Прафесійная арыентацыя дзяцей-інвалідаў

Прафесійная арыентацыя дзяцей-інвалідаў уключае:

прафесійную адукацыю і асвету;

прафесійную дыягностыку;

прафесійнае выхаванне;

прафесійную кансультацыю;

прафесійны падбор.

Прафесійная арыентацыя дзяцей-інвалідаў ажыццяўляецца ў агульнаадукацыйных, спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах (школах) пры ўдзеле цэнтраў прафесійнай арыентацыі моладзі і педагагічных работнікаў навучальных устаноў прафесійнай адукацыі.

Прафесійная асвета ажыццяўляецца агульнаадукацыйнымі школамі ў працэсе вывучэння гуманітарных і прыродазнаўча-матэматычных прадметаў, прадмета «Асновы выбару прафесіі». У прафесійнай асвеце прымаюць удзел дзяржаўныя службы занятасці, медыцынскія рэабілітацыйныя экспертныя камісіі, а таксама навучальныя ўстановы прафесійнай адукацыі.

Прафесійная дыягностыка і прафесійны падбор забяспечваюць выбар прафесіі, якая адпавядае інтарэсам, схільнасцям, задаткам прафесійных здольнасцей, стану здароўя, кан'юнктуры рынку працы. Прафесійная дыягностыка ажыццяўляецца лячэбна-прафілактычнымі ўстановамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і цэнтрамі прафесійнай арыентацыі моладзі.

Прафесійны падбор ажыццяўляецца цэнтрамі прафесійнай арыентацыі моладзі.

Прафесійнае выхаванне прадугледжвае фарміраванне прафесійных інтарэсаў, схільнасцей, прафесійнай прыгоднасці і ажыццяўляецца паэтапна дашкольнымі ўстановамі, агульнаадукацыйнымі школамі, навучальнымі ўстановамі прафесійнай адукацыі.

Прафесійная кансультацыя ажыццяўляецца штатным псіхолагам, медыцынскім работнікам навучальнай установы з прыцягненнем спецыялістаў медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі, цэнтраў прафесійнай арыентацыі моладзі і педагагічных работнікаў навучальных устаноў прафесійнай адукацыі.

Органы адукацыі нясуць адказнасць за арганізацыю работы па прафесійнай арыентацыі дзяцей-інвалідаў.

Артыкул 26. Прафесійная арыентацыя інвалідаў у працаздольным узросце

Прафесійная арыентацыя інвалідаў у працаздольным узросце ўключае:

прафесійную інфармацыю і кансультацыю;

прафесійны адбор;

індывідуальную адаптацыю на вытворчасці.

Дзяржаўная служба занятасці ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі забяспечвае аказанне прафесійна-арыентацыйных паслуг інвалідам у працаздольным узросце з мэтай вызначэння іх магчымасцей да прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і далейшай занятасці.

Прафесійная арыентацыя інвалідаў ажыццяўляецца на аснове распрацоўваемых рэспубліканскіх і рэгіянальных праграм занятасці, якія ўлічваюць канкрэтныя ўмовы, патрэбнасці рынку працы рэспублікі і асобных рэгіёнаў і зацвярджаюцца Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь і мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

Дзяржава забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў у галіне прафесійнай арыентацыі інвалідаў.

Артыкул 27. Прафесійная падрыхтоўка, перападрыхтоўка і працаўладкаванне інвалідаў

Дзяржава гарантуе прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі інвалідаў і звязанае з гэтым абслугоўванне у адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Прафесійная падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка інвалідаў, зарэгістраваных у Дзяржаўнай службе занятасці ў якасці беспрацоўных, ажыццяўляюцца ў навучальных цэнтрах дзяржаўнай службы занятасці або ў іншых навучальных установах, а таксама на прадпрыемствах, ва ўстановах, у арганізацыях.

Прафесійная перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі інвалідаў ажыццяўляюцца на спецыяльных аддзяленнях па перападрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (спецыяльных і агульнага тыпу), інстытутаў і факультэтаў павышэння кваліфікацыі, пералік якіх вызначаецца Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, а таксама ў сетцы навучальна-курсавых камбінатаў і на вытворчасці.

Прафесійная перападрыхтоўка інвалідаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі па дагаворах з прадпрыемствамі, арганізацыямі, аб'яднаннямі ўсіх форм уласнасці.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў сумесна з грамадскімі арганізацыямі інвалідаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам за кошт уласных сродкаў, прадастаўлення падатковых ільгот і іншых крыніц устанаўліваюць прадпрыемствам, установам і арганізацыям мінімальную колькасць спецыяльных рабочых месцаў для прыёму на работу інвалідаў.

Дзяржаўная служба занятасці пры неабходнасці мае права патрабаваць ад прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і прадпрымальнікаў распрацаваць і прадставіць план арганізацыі рабочых месцаў і працаўладкавання інвалідаў у лік квоты.

Артыкул 28. Патрабаванні да спецыялізаваных рабочых месцаў для працаўладкавання інвалідаў

Галіновыя міністэрствы і ведамствы распрацоўваюць і зацвярджаюць ва ўстаноўленым парадку рэспубліканскія стандарты на спецыялізаваныя рабочыя месцы для працаўладкавання інвалідаў.

Дзяржаўнай інспекцыяй працы сумесна з Камітэтам па метралогіі, стандартызацыі і сертыфікацыі, а таксама Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам рэабілітацыі інвалідаў такія рабочыя месцы на працягу года падлягаюць абавязковай атэстацыі. Па сканчэнні ўказанага тэрміну прымяненне працы інвалідаў на неатэставаных спецыялізаваных рабочых месцах забараняецца.

Суб'екты гаспадарання, вінаватыя ў парушэнні выкладзеных патрабаванняў, нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 29. Адказнасць суб'ектаў гаспадарання за непрынящце мер па працаўладкаванню інвалідаў

Суб'екты гаспадарання нясуць адказнасць за непрынящце мер па працаўладкаванню інвалідаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 30. Прафесійная адукацыя інвалідаў

Дзяржава гарантуе інвалідам доступ да бясплатнай прафесійнай адукацыі ўсіх узроўняў і звязанае з гэтым абслугоўванне ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі.

Прафесійная адукацыя інвалідаў з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальнай сістэмы адукацыі і ўключае:

прафесійна-тэхнічную адукацыю;

сярэднюю спецыяльную адукацыю;

вышэйшую адукацыю;

падрыхтоўку навуковых і навукова-педагагічных кадраў;

павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў.

У мэтах інтэграцыі ў грамадства прафесійная адукацыя інвалідаў ажыццяўляецца ў навучальных установах агульнага тыпу.

Прафесійная адукацыя інвалідаў з цяжкімі або шматлікімі формамі інваліднасці (устанаўліваецца медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй) ажыццяўляецца ў спецыяльных навучальных установах (прафесійна-тэхнічных вучылішчах, тэхнікумах, цэнтрах медыка-прафесійнай рэабілітацыі).

Прафесійнае навучанне асоб з паражэннем органаў зроку і слыху можа ажыццяўляцца ў спецыяльных групах навучальных устаноў агульнага тыпу.

Пры адсутнасці магчымасці ажыццяўляць прафесійную адукацыю інвалідаў у агульных і спецыяльных навучальных установах іх навучанне арганізуецца дома па індывідуальных вучэбных планах, калі гэта форма навучання дапускаецца зместам прафесійнага навучання па пэўнай спецыяльнасці.

Прафесійная адукацыя ажыццяўляецца ў адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі, пералікам прафесій і спецыяльнасцей, па якіх могуць навучацца інваліды, што зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Міністэрствам працы Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь пры ўдзеле грамадскіх арганізацый інвалідаў.

Прафесійнае навучанне інвалідаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючымі дзяржаўнымі стандартамі адукацыі.

Артыкул 31. Сістэма органаў прафесійнай рэабілітацыі

Арганізацыю навучання і прафесійна-тэхнічную адукацыю дзяцей-інвалідаў і дзяцей з недастатковым разумовым і фізічным развіццём ажыццяўляюць органы адукацыі, а прафесійная арыентацыя ажыццяўляецца імі сумесна з цэнтрам прафесійнай арыентацыі моладзі.

Магчымасць атрымання сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку навуковых і навукова-педагагічных кадраў, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі інвалідаў забяспечваюць Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, а таксама навучальныя ўстановы.

Аказанне прафесійна-арыентацыйных паслуг, прафесійную падрыхтоўку і працаўладкаванне інвалідаў у працаздольным узросце, зарэгістраваных у якасці беспрацоўных, арганізуе Дзяржаўная служба занятасці.

ГЛАВА 5. САЦЫЯЛЬНАЯ РЭАБІЛІТАЦЫЯ

Артыкул 32. Тэхнічныя і іншыя дапаможныя сродкі для аблягчэння працы і быту інвалідаў

Дзяржава забяспечвае распрацоўку, вытворчасць, размеркаванне і абслугоўванне тэхнічных і іншых сродкаў для аблягчэння працы і быту інвалідаў, а таксама распаўсюджванне аб іх інфармацыі.

Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвярджае і ўдакладняе Дзяржаўны рэестр (пералік) тэхнічных і іншых дапаможных сродкаў, якія выдзяляюцца інвалідам органамі сацыяльнай абароны бясплатна або на льготных умовах.

У гарадах і раённых цэнтрах пры органах сацыяльнай абароны ствараюцца комплексныя пункты сервіснага абслугоўвання па прадастаўленню з улікам патрэбнасцей інвалідаў дапаможных паслуг, уключаючы тэхнічныя і іншыя дапаможныя сродкі.

Дзяржава прымае асобыя меры па забеспячэнню інвалідаў сельскіх раёнаў паслугамі ў галіне прафесійнай рэабілітацыі. Развіццё такіх паслуг павінна быць састаўной часткай нацыянальнай палітыкі развіцця сельскіх раёнаў.

Артыкул 33. Задачы прадпрыемстваў рэабілітацыйнай індустрыі

Асноўнымі задачамі прадпрыемстваў рэабілітацыйнай індустрыі з'яўляюцца:

распрацоўка, асваенне, вытворчасць і рэалізацыя вырабаў, якія аблягчаюць працу і быт інвалідаў, кампенсуюць або аднаўляюць парушаныя або страчаныя функцыі арганізма;

аказанне розных паслуг па абслугоўванню і рамонту выпускаемых вырабаў;

забеспячэнне інвалідаў сродкамі рэабілітацыі ў адпаведнасці з іх патрэбнасцямі;

садзейнічанне працоўнай занятасці інвалідаў у адпаведнасці з патрабаваннем індывідуальных праграм рэабілітацыі.

Прадпрыемствы рэабілітацыйнай індустрыі карыстаюцца рэжымам найбольшага спрыяння, які заключаецца ў прадастаўленні фінансавых ільгот, ва ўключэнні выпускаемай прадукцыі ў склад дзяржаўнага заказу, у прадастаўленні ільгот на выдзяленне зямельных участкаў і памяшканняў. Парадак прадастаўлення гэтых ільгот устанаўліваецца Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 34. Стандартызацыя, уніфікацыя, выпрабаванне і забеспячэнне якасці рэабілітацыйнай тэхнікі і сродкаў механізацыі для аблягчэння працы і быту інвалідаў

Для правядзення работ па стандартызацыі, уніфікацыі і забеспячэнню якасці рэабілітацыйнай тэхнікі і сродкаў механізацыі для аблягчэння працы і быту інвалідаў, правядзення выпрабаванняў узораў рэабілітацыйнай тэхнікі ў сістэме Міністэрства сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ствараецца пастаянна дзеючая служба -- Каардынацыйны навукова-тэхнічны цэнтр сродкаў інватэхнікі (рэабілітацыйнай тэхнікі і абсталявання).

Артыкул 35. Ліцэнзаванне дзейнасці па аказанню дапамогі і паслуг інвалідам

Медыцынская і прафесійная рэабілітацыя інвалідаў, пратэзна-артапедычная дапамога, прадастаўленне ім тэхнічных або іншых дапаможных сродкаў, індывідуальнай дапамогі і паслуг ажыццяўляюцца дзяржаўнымі службамі міністэрстваў і ведамстваў. Грамадскія арганізацыі і асобныя грамадзяне маюць права займацца дадзеным відам дзейнасці пры наяўнасці адпаведнай ліцэнзіі (дазволу).

Ліцэнзіі (дазволы) выдаюцца Каардынацыйным навукова-тэхнічным цэнтрам сродкаў інватэхнікі.

Артыкул 36. Якасць спецыялізаваных вырабаў, якія выпускаюцца для інвалідаў

Спецыялізаваныя вырабы серыйнай вытворчасці, якія выпускаюцца для інвалідаў (каляскі, апараты, прыстасаванні і інш.), падлягаюць абавязковай сертыфікацыі ў Нацыянальнай сістэме сертыфікацыі ў адпаведнасці з наменклатурай, што зацвярджаецца ва ўстаноўленым парадку. Рэалізацыя такіх вырабаў без сертыфіката і знака, якія пацвярджаюць адпаведнасць вырабаў патрабаванням стандартаў або іншых нарматыўна-тэхнічных дакументаў, забараняецца.

У выпадку рэалізацыі несертыфікаваных вырабаў вырабшчык (прадавец) па прадпісанню органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны кантроль за якасцю вырабаў, выплачвае ў даход дзяржаўнага бюджэту штраф у памеры кошту рэалізаваных вырабаў, калі заканадаўствам не ўстаноўлены іншы від адказнасці.

Артыкул 37. Эканамічныя меры стымулявання ўдзелу інвалідаў у жыцці грамадства

Дзяржава забяспечвае прымяненне эканамічных мер (пазыкі, ільготнае падаткаабкладанне, ільготныя тарыфы, пошліны, мэтавыя субсідыі, спецыяльныя фонды і г. д.) у мэтах стымулявання і аказання падтрымкі раўнапраўнага ўдзелу інвалідаў у жыцці грамадства, прадукцыйнай працы.

Артыкул 38. Аказанне інвалідам штодзённай дапамогі (патранажных паслуг)

